# ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ГЛАВЫ ДЗЯРЖАВЫ Ў СІСТЭМЕ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIV–XVI СТСТ.)

**В. М. Бічун**
*аспірант кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаюцца нормы, якія вызначаюць прававое становішча манарха ў сістэме органаў дзяржаўнай улады Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIV–XVI стагоддзяў.

В статье рассматриваются нормы, которые определяют правовое положение монарха в системе органов государственной власти Великого Княжества Литовского во второй половине XIV–XVI столетий.

The article deals with the norms that determine the legal status of the monarch in the system of public authorities of the Grand Duchy of Lithuania in the second half of the XIV-XVI centuries.

Вялікае Княства Літоўскае з’яўлялася феадальнай манархіяй, якую ўзначальваў манарх – Вялікі князь. Манархічная форма кіравання ў ВКЛ у XIV–XVI стст. характарызавалася засяроджваннем у руках Вялікага князя (гаспадара) даволі шырокіх уладных паўнамоцтваў. Ён камандаваў узброенымі сіламі, здзяйсняў адміністрацыйна-распарадчую дзейнасць і правасуддзе, кіраваў унутранай і знешняй палітыкай дзяржавы, каардынаваў фінансава-гаспадарчую дзейнасць, выдаваў граматы, іншыя прававыя акты (г.зн. ажыццяўляў праватворчую дзейнасць) і інш.

Такое засяроджванне ўлады ў адных руках гаспадара спачатку было выгодным усім вольным землеўласнікам, бо ў гэты перыяд ішоў інтэнсіўны працэс захопу і прысваення зямель кіруючай вярхушкай феадалаў і дзяржавай. Землеўласнік атрымваў з рук гаспадара падаравальную грамату, якой зямля передавалася ў яго ўладанне разам з насельніцтвам, што пражывала на гэтай зямлі і абавязвалася ўносіць яму пажыццёвую рэнту. Гэтым ён прызнаваў у асобе Вялікага князя ўласніка ўсёй дзяржавы, які меў уладныя паўнамоцтвы пераразмяркоўваць землі і ставіць у залежнасць ад землеўласніка тых людзей, што пражывалі на гэтай зямлі.

Але як толькі буйныя землеўласнікі дабіліся манапольнага права валодання зямлёй, яны пачалі імкнуцца да абмежавання ўлады Вялікага князя. З гэтай мэтай адраджаецца старажытная народная ідэя разумення ўлады гаспадара як службовай асобы, якая павінна ахоўваць інтарэсы народа. Толькі пад “народам” пачалі разумець не ўсіх людзей у

дзяржаве, а толькі асоб, якія выконвалі воінскую павіннасць і ўваходзілі ў склад прывілеяванага саслоўя баяраў-шляхты.

Гэтае дваістае дачыненне кіруючай эліты да паўнамоцтваў гаспадара дзяржавы атрымала сваё адлюстраванне ў шматлікіх нарматыўна-прававых актах XIV–XVI стст. У іх Вялікі князь, з аднаго боку, прызнаецца гаспадаром дзяржавы, які валодае ўсей паўнатой улады, а з другога боку – гаворыцца, што ён з’яўляецца службовай асобай, абавязанай здзяйсняць рашэнні рады і сойма, дзейнічаць у поўнай адпаведнасці з законам. Менавіта гэтыя нарматыўныя палажэнні з’яўляюцца юрыдычна замацаваным сведчаннем імкнення кіруючай феадальнай вярхушкі да абмежавання ўлады гаспадара ў ВКЛ.

Спачатку Вялікія князі выбіраліся вузкім колам буйных і радавітых феадалаў з прадстаўнікоў дома Гедзімінавічаў (пазней Ягайлавічаў), а з канца XV ст. – вальным (агульным) соймам.

Пры ажыццяўленні дзяржаўнай улады Вялікі князь абапіраўся на органы цэнтральнага і мясцовага кіравання і службовых асоб. У тым ліку буйных землеўласнікаў, якія былі яго бліжэйшымі дарадчыкамі і складалі гаспадарскую раду. Рада (паны-рада) у XIII – XIV стст. была асноўным дарадчым органам пры гаспадары, аднак у далейшым яна ўсё больш пачала адыгрываць галоўную, вырашальную ролю ў дзяржаўных справах. Так, па рашэнні радных паноў Віцень быў абраны Вялікім князем ВКЛ. З іх жа згоды пасля смерці князя Альгерда на велікакняжацкі трон уступіў Ягайла. У канцы 40-х гг. XV ст. Казімір Ягайлавіч ужо казаў, што ў дзяржаўных справах ён нічога не мог вырашыць без рады.

Рада паступова становіцца вышэйшым дзяржаўным органам, які істотна абмяжоўвае ўладу гаспадара – Вялікага князя. Аднак і пазіцыя Вялікага князя ў вырашэнні тых ці іншых пытанняў па-ранейшаму заставалася значнай. Існуюць шматлікія звесткі, што Вялікія князі радзіліся з буйнымі землеўласнікамі па ўсіх найважнейшых дзяржаўных справах. У першую чаргу аб гэтым сведчаць летапісы, граматы і дагаворы з іншымі дзяржавамі. У склад рады пачалі ўваходзіць прадстаўнікі вышэйшага духавенства, самыя вышэйшыя службовыя асобы дзяржаўнага апарату, мясцовыя кіраўнікі – ранейшыя ўдзельныя князі, а цяпер княжацкія ваяводы і старасты. А таксама князі тых мясцовых княстваў, што яшчэ заставаліся [3, с. 59].

Вучоныя адносяць прыкладна да XIV стагоддзя пачатак склікання больш шырокіх нарад феадалаў – пашыранага пасяджэння рады – соймаў, якія ў XIV –XV стст. мелі больш значэнне органа дарадчага, але паступова сойм набывае заканадаўчыя функцыі. У канцы XVI ст. сойм пераўтвараецца ў сапраўдны вышэйшы заканадаўчы орган ВКЛ, нешта

накшталт феадальнага парламента. У гэты перыяд у яго ўваходзілі Вялікі князь і паны радныя – як вышэйшая палата сойма, а таксама прадстаўнікі ад мясцовай шляхты – як ніжэйшая палата.

У дауніяльны перыяд Польшча і ВКЛ мелі розныя мадэлі саслоўнага і дзяржаўнага ладу. Саюз ВКЛ і Польшчы пад уладай аднаго манарха ўнёс карэнныя змены ў дзяржаўнае ўладкаванне абедзвюх дзяржаў. Уся гісторыя гэтых народаў на працягу 400 гадоў знаходзілася пад уздзеяннем гэтага саюза, пачатак якому быў пакладзены ў 1385 г. заключэннем Крэўскай уніі. Вялікі князь Ягайла ўступіў у 1386 г. на польскі пасад і стаў каралём Польшчы.

Пасля заняцця Ягайлам польскага трону Вялікім князем ВКЛ стаў яго брат Скіргайла. Правы Скіргайлы на кіраванне дзяржавай былі замацаваны выдадзенай Ягайлам у 1387 г. спецыяльнай граматай (прывілеем). Гэты прывілей быў накіраваны на ўмацаванне ўлады Скіргайлы ў дзяржаве, аднак галоўнае прававое значэнне гэтага дакумента – пацверджанне дзяржаўнай адасобленасці ВКЛ ад Польшчы. Ягайла прызнаў і замацаваў правы Скіргайлы на велікакняжацкі трон і абяцаў “крепко блюсти его княженья и державы”. Разам з тым, уступіўшы на польскі пасад, Ягайла не склаў з сябе паўнамоцтваў гаспадара Вялікага Княства. Ён стаў найвышэйшым князем ВКЛ і адначасова з’яўляўся кіраўніком дзвюх дзяржаў [6, с. 115].

Эліта ВКЛ не была зацікаўлена ў узмацненні цэнтралізацыі Польшчы і імкнулася заканадаўча замацаваць уласны статус. Віленска-Радамская унія 1401 г. пацвердзіла адасобленасць і суверэнітэт ВКЛ, а таксама правы вялікага князя як самастойнага гаспадара дзяржавы. Гэты дагавор ясна вызначыў сутнасць дзяржаўна-прававога саюза ВКЛ з Польшчай як персанальную унію дзвюх дзяржаў пад вяршэнствам аднаго манарха. У дагаворы рабілася спроба юрыдычна абгрунтаваць спадчынны характар велікакняжацкай улады ў адносінах да Ягайлы і яго спадчыннікаў, хоць феадалы, якія складалі кіруючыя вярхі ВКЛ, выступалі за захаванне старажытнай практыкі абрання вялікага князя.

Гарадзельская унія 1413 г. уяўляла сабой дамову двух манархаў аб больш цесным саюзе дзяржаў. Аднак, гэты дакумент меў супярэчлівыя палажэнні. Так, у першым артыкуле канстатавалася, што ўсе землі, аб’яднаныя ў ВКЛ, гаспадары Ягайла і Вітаўт “да каралеўства Польскага моцна інкарпаравалі, аб’ядналі, злучылі ў адзіны саюз”. Сцвярджэнне таго, што Ягайла і Вітаўт валодаюць землямі ВКЛ на падставе спадчынных правоў, было ілжывым увогуле, бо з самых старажытных часоў у дзяржаве існавала ідэя выбрання князя і яго дагавору з народам. Да таго ж гэтае сцвярджэнне супярэчыла арт. 11, дзе гаварылася, што феадалы ВКЛ не будуць выбраць сабе новага князя без згоды караля

Ягайлы і польскіх паноў, а таксама пасля смерці польскага караля без нашчадкаў палякі не павінны выбіраць сабе новага караля без згоды вялікага князя і паноў рады ВКЛ. Тым самым гэты артыкул зводзіў на нішто першы артыкул, бо захоўваў адасобленасць ВКЛ і юрыдычна замацоўваў канстытуцыйны характар выбарнасці пасады Вялікага князя.

Вялікі князь Казімір быў прыхільнікам моцнай манархічнай улады і, умацоўваючы ўладу, ён вымушаны быў абапірацца на шляхту як у Польшчы, так і ВКЛ. 27 чэрвеня 1447 г. Казімір стаў каралём Польшчы. Прымаючы польскую карону, ён павінен быў упэўніць сацыяльную эліту грамадства, што яе інтарэсы не пацерпяць страты. Казімір імкнуўся заручыцца падтрымкай усёй шляхты і таму дальнабачна выбраў палітыку манеўрыравання паміж праваслаўнымі і каталікамі. Не зважаючы на рэлігійную прыналежнасць, ён надзяляў шляхту шырокімі прывілеямі і пасадамі. Істотнае значэнне для ВКЛ маюць артыкулы прывілея Казіміра 1447 г., у якіх заканадаўча замацоўвалася тэрытарыяльная цэласнасць дзяржавы, яе суверэнныя правы і адначасова забаранялася раздаваць чужаземцам дзяржаўную маёмасць і пасады [1, с. 23].

Прывілей Аляксандра 1492 г. юрыдычна аформіў узрослую ролю паноў-рады ў дзяржаве. Усе дзяржаўныя пытанні і судовыя пастановы, якія былі вырашаны з панамі-радай, Вялікі князь не мог “змяняць, выпраўляць або перапарадкоўваць”. Князь нават абавязваўся не гневацца на паноў-раду ў выпадку ўзнікнення рознагалосся пры абмеркаванні дзяржаўных спраў і выконваць тое, што раіла рада [1, с. 85].

Прычынай узвышэння рады ў адносінах да Вялікага князя з’яўлялася асабістая унія Польшчы і ВКЛ. У гэтым разуменні Прывілей Аляксандра 1492 г. выступае спробай магнатаў адстаяць нацыянальныя інтарэсы, якімі маглі ахвяраваць Ягелоны. Рада стварала пэўную сістэму стрымак і супрацьваг, бо не была ўпэўнена ў шчырым выкананні Гаспадаром сваіх абавязкаў у дачыненні да Літвы. Адначасова ў Польшчы адбывалася тэндэнцыя павышэння ролі дробнай шляхты і заняпаду цэнтральнай улады, што, без сумневу, падагравала інтарэсы адпаведных колаў у ВКЛ. Вялікі князь меў у Літве больш улады, чым кароль у Польшчы, дзе ён адчуваў націск з боку магнатаў і шляхты і, каб задаволіць іх, а таксама рэалізаваць дынастыйныя інтарэсы, ахвяраваў інтарэсамі Княства на карысць Польшчы і Ягелонаў [5, с. 88].

У кастрычніку 1501 г. пры абранні на польскі трон Вялікага князя Аляксандра ў г. Мельніку была падпісана новая дзяржаўная унія паміж ВКЛ і Польшчай. Мельніцкі акт прадугледжваў пажыццёвае выбранне агульнага манарха на агульным сойме, правядзенне агульнай унутранай і

знешняй палітыкі, увядзенне адзінай грашовай сістэмы і інш. У Княстве заставаліся асобныя дзяржаўныя пасады, аднак службовыя асобы павінны былі прысягнуць на вернасць каралю. Фактычна унія, якую падпісалі разам з Аляксандрам 27 прадстаўнікоў Княства з умовай зацвярджэння яе сомам ВКЛ, вяла да ліквідацыі яго самастойнасці. 25 кастрычніка 1501 г. Аляксандр выдаў Мельніцкі прывілей, якім была значна павялічана роля сената, без згоды якога ўсе дзеянні караля не мелі юрыдычнай моцы. У выніку шырокай апазіцыі шляхты прывілей, большасць артыкулаў якога не дзейнічала, быў скасаваны ў 1505 г. Таксама сойм ВКЛ не зацвердзіў Мельніцкі акт [3, с. 83].

У грамаце ад 7 снежня 1506 г. адзначаецца, што Вялікі князь выбіраецца са згоды духоўных і свецкіх феадалаў і іншых падданых і жыхароў дзяржавы.

Фактычна наступная Люблінская унія 1569 г. была прадвырашана ўсім папярэднім ходам падзей і асабліва тымі адносінамі з Польшчай, якія склаліся ў рэчаіснасці. У перыяд знаходжання на велікакняжацкай і каралеўскай пасадах Жыгімонта І і Жыгімонта ІІ Аўгуста захоўваўся персанальны характар уніі. Аднак кіруючая эліта ВКЛ неаднаразова вяла перамовы з прадстаўнікамі Польшчы аб больш цесным саюзе абедзвюх дзяржаў, але пры ўмове захавання раўнапраўя і “братэрства”. Асабліва ярка ідэя роўнасці дзяржаў была выяўлена ў пастанове Віленскага сойма 1563 г. У гэтым дакуменце гаспадар абавязваўся не парушаць папярэдніх законаў (“перших привильев”), а дэлегатам даручалася строга ахоўваць гонар і годнасць ВКЛ, сачыць за тым, каб правы ўсяго насельніцтва дзяржавы не парушаліся і не былі прыніжаныя Польшчай. Было прызнана дапушчальным існаванне аднаго манарха для абедзвюх дзяржаў і скліканне сумесных соймаў для вырашэння агульных спраў, але пры гэтым павінны былі захоўвацца ў кожнай дзяржаве самастойныя органы ўлады, уласная казна, узброеныя сілы і заканадаўства. Такія ўмовы пацвярджаліся і падтрымліваліся шляхтай на ўсіх наступных соймах ВКЛ [4, с. 37-39].

Такім чынам бачна, што ВКЛ ў XIV –XVI стст. характарызавалася засяроджваннем у руках Вялікага князя даволі шырокіх уладных паўнамоцтваў, але ў адпаведнасці з заканадаўствам Вялікі князь не прызнаваўся ўласнікам дзяржавы, а быў толькі пажыццёва абранай службовай асоба, гаспадаром дзяржавы, правы і абавязкі якога вызначаліся законамі дзяржавы. У другой палове XVI стагоддзя з заключэннем Люблінскай уніі кампетэнцыя каралеўскай улады ў Рэчы Паспалітай была таксама вялікай. Аднак у 1572 г. памёр кароль Жыгімонт ІІ Аўгуст, пагасла дынастыя Ягелонаў і пасля гэтага адбываецца значнае паслабленне каралеўскай улады. Акрамя таго пасля

яго смерці ў дзяржаве было ўсталявана вольнае абранне караля без звяртання ўвагі на дынастычную прыналежнасць.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Васілевіч Р.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р. А. Васілевіч, Т. І. Доўнар, І. А. Юхо. Мінск : ВТАА "Права і эканоміка", 2001. 363 с.
2. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права: дапаможнік / Я. А. Юхо [і інш.]. Мінск : БДУ, 2000. С. 85.
3. Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. 416 с.
4. Доўнар Т.І. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года / Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо. Мінск, 2003. С. 37–39.
5. Калінін С.А. Аб тэарэтыка-метадалагічных праблемах вывучэння беларускай дзяржаўнасці // Гісторыя і сучаснасць : беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце : зборнік навуковых прац, прысвечаных 90-годдзю з дня нараджэння прафесара Я. А. Юхо / рэдкал.: С. А. Балашэнка (гал. рэд.) і [інш.]. Мінск : Бизнесофсет, 2012. С. 88.
6. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. Мінск : РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. 352 с.